Падтрымай "Вясну" на PATREON

Дзень ведаў у Слуцку для мастака Алеся Пушкіна завяршыўся трыма пратаколамі

17.10.2017



Акцыя ў Слуцку 1 верасня. Фота: "Новы Час".

Пасля «ўроку гісторыі» пра Слуцкае паўстанне супраць вядомага мастака Алеся Пушкіна распачаты 3 адміністратыўныя справы па трох артыкулах КаАП.

Як паведаміў "Новаму Часу" мастак Алесь Пушкін, сёння, 16 кастрычніка, у 11-40 да яго дамоў завітаў капітан Дзмітрый Мацкевіч з Крупскага РАУС. Капітан міліцыі ўручыў яму аж 3 адміністратыўныя пратаколы: першы — па ч.1 арт. 23.34 КаАП (парушэнне вызначанага парадку сходаў, мітынгаў і

шэсцяў падчас “уроку гісторыі” ў Слуцку), другі — па ч. 2 артыкула 21.14 (парушэнне правіл утрымання населеных пунктаў), а трэці — па ч.1 артыкула 9.4 КаАП.

Мастак парушыў правілы ўтрымання населеных пунктаў, бо прымацаваў на часовым плоце, якім акружана месца рамонту Слуцкага краязнаўчага музея, ажно 3 партрэты ўдзельнікаў Слуцкага збройнага чыну.

Алесь Пушкінтаксама будзе прыцягнуты да адказнасці **з**годна з часткай 1 артыкула 9.4 КаАП — **за “*невыкананне бацькамі або асобамі, якія іх замяняюць, абавязкаў па выхаванні дзяцей*,** *што пацягнула здзяйсненне непаўналетнім дзеі, якая змяшчае прыкметы адміністрацыйнага правапарушэння або злачынства…”*

Паколькі 8-класнік Коля таксама ажыццявіў “злачынства” — не пайшоў на лінейку ў школу, а прысутнічаў разам за бацькам у Слуцку на недазволеным “уроку гісторыі”, бацька будзе несці за гэта адказнасць.

Алесь Пушкін напісаў тлумачэнне да пратаколаў, якія датычацца **“слуцкай гісторыі”**. У тлумачэнні ён не лічыць сябе ў чымсьці вінаватым, “*бо гэта быў яго свядомы ўчынак як бацькі, каб выхаваць сына патрыётам і каб ён практычна даведаўся пра гісторыю Случчыны*”. Мастак паабяцаў, што так яны з сынам будуць рабіць і найдалей: кожны год 1 верасня будуць выязджаць у іншыя рэгіёны Беларусі, знакамітыя сваёй гістарычнай спадчынай, і праводзіць там Дзень ведаў.

Дзень, калі пачнецца суд над Алесем Пушкіным, пакуль што не вядомы.

Нагадаем, што 16 кастрычніка суд Слуцкага раёна пакараў за акцыю 1 верасня актывістку Аліну Нагорную, прысудзіўшы ёй штраф у памеры 20 базавых велічынь, а сёння ў судзе Маскоўскага раёна Мінска будзе разглядацца адміністратыўная справа палітолага **Алеся Лагвінца,** таксама за акцыю да Дня ведаў у Слуцку.

Твитнуть







Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ



Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"



#ВалюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра

пераслед па "справе цюкоў"

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

СЯБРОЎСТВА

EENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY